**канферэнцыі**

# Да новых гарызонтаў

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Максім Багдановіч — новыя гарызонты навуковых даследаванняў».**

З дакладам выступілі прадстаўнікі Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

Актыўны ўдзел у канферэнцыі бралі навуковыя супрацоўнікі беларускіх і расійскіх музеяў: Цэнтра беларускай культуры (музей М. Багдановіча, г. Яраслаўль), літаратурнага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, Літаратурнага музея Петруся Броўкі, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і інш.

Міжнародны форум засведчыў вялікую цікавасць да асобы і творчасці Максіма Багдановіча. Вызначаны перспектыўныя кірункі архіўных пошукаў і навуковых даследаванняў.

**Мікола ТРУС**